

Жыве Беларусь!

Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№48(561) 12 сакавіка 1993 г. Пятніца. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 607902 экз. Кошт у розніцу — 4 руб.

ФАКС

Вкратце

Министр обороны Беларуси генерал-полковник Павел Козловский провел совещание с руководящим составом воинских частей России, которые дислоцируются на территории республики.

Были обсуждены проблемы обеспечения сохранности военного имущества, повышения ответственности командиров и начальников за действия, которые нарушают межгосударственные соглашения между Беларусью и Россией по военным вопросам.

❑

По сведениям БелаПАН, в Киеве разрабатывается вариант создания российско-украинского специализированного банка, который занимался бы финансированием нефтегазовых проектов.

Как известно, Россия требует ввести расчеты на уровне мировых цен, согласно которым 1000 куб.метров газа обойдутся Украине в 85 долларов США.

... И сердцу тревожно в груди

Съезд народных депутатов России вчера принял проект постановления, который фактически отменяет конституционный референдум.

Целью референдума, назначенного Борисом Ельциным, было разграничить полномочия исполнительной и законодательной ветвей власти. Депутаты также отвергли предложение президента России о претворении в жизнь временного соглашения, достигнутого между Б.Ельциным и главой парламента Р.Хасбулатовым в декабре прошлого года. Соглашение предусматривало прекращение борьбы за власть до проведения апрельского референдума.

Борис Ельцин призвал депутатов сделать выбор между согласием и конфронтацией.

Будем славить СС, как славили КПСС?

50-летие дивизии СС "Галичина", воевавшей в годы второй мировой войны на стороне фашистской Германии, решил отметить Союз офицеров Украины.

В торжествах, которые пройдут во Львове и под Бродами, где была разгромлена дивизия, примут участие бывшие воины этого соединения и конгресс украинских националистов.

Галина НЕКРАСОВА.

Премьеру дали 15 суток...

Сейм Литвы на первом заседании открывшейся весенней сессии одобрил кандидатуру 45-летнего кандидата экономических наук Адольфаса Шлежявичюса на пост премьер-министра республики.

Согласно конституции, его кандидатуру представил президент Литвы Альгирдас Бразаускас.

В течение 15 дней новый премьер должен представить на утверждение президента список членов правительства и подготовить правительственную программу.

Владас БУРБУЛИС.

Торги нам строить и жить помогают

Очередные конкурсные торги — на этот раз по незавершенным и неначатым стройкам — пройдут в Минске в конце марта.

Мероприятие, окончательная дата которого определится на будущей неделе, пройдет в два этапа. На первом комиссия горисполкома познакомит потенциальных покупателей с объектами и проведет нечто вроде аукциона. Несколько фирм, предложивших по каждому объекту наиболее весомые цены,станут "финалистами", из числа которых закрытое заседание комиссии определит покупателей.

На этот раз хозяев ищут шесть недостроенных и двенадцать неначатых объектов — кафе, магазины, предприятия бытового обслуживания.

Ирина ФЕДОРОВА.



Рисунок Олега ПОПОВА.

"Буржуазия" в Доме офицеров

Завтра в минском Доме офицеров любителей блюза ожидает приятный сюрприз.

Вечер, который собираются подарить меломанам группы "Крама", "Буржуазия", "Зиндан", а также певец из Италии, по словам участников концерта, будет образцом сочетания хорошей музыки и безупречной организации. Что ж, посмотрим и послушаем...

Алесь СИВЫЙ.

Спорт-экспресс

Офицер белорусской армии, именитый конькобежец из Минска Игорь Железовский был удостоен почестей высшего начальства. Министр обороны Беларуси подарил шестикратному чемпиону мира новый пневматический пистолет. Кроме того, Игорь получил из рук председателя Госкомспорта Владимира Рыженкова в качестве приза 120 тысяч рублей и часы с эмблемой МОКа Беларуси.

❑

В матче по художественной гимнастике в Париже между командами России, Беларуси и Франции в личном первенстве победу одержала наша землячка Татьяна Огрызко. Она же первенствовала в упражнениях со скакалкой, булавами и обручем.

❑

Форвард ростовского "Ростсельмаша" Александр Татаркин тайком сбежал из футбольной команды с большой суммой денег. Предварительное расследование показало, что беглец вроде бы подался в Югославию.

Ставки удваиваются, господа!

Похоже, Национальный банк Беларуси решил серьезно изменить свою финансовую политику.

На днях приняты два важных решения: теперь процентные ставки по кредитам увеличиваются в два раза и составят 60 процентов. А для того, чтобы денежки текли в банк, повысить дивиденды на вклады предприятий. Так, если фирма положит в Национальный банк 10 "лимонов", то через полгода получит уже двадцать.

Антон ЧЕКОВ.

Надежды на урну пошли прахом

Так и не обрел в прошедшие выходные своего депутата в высшем законодательном органе Беларуси Гомельский — Краснооктябрьский избирательный округ N 168.

Выборы с треском провалились. По сообщению комиссии, из 23.000 избирателей к урнам явилось меньше четырех тысяч. Характерно, что баллотировались на этот раз в депутаты люди, стоящие на прокоммунистической платформе. К моменту выборов двое из них сняли свои кандидатуры. И все же результат плачевный: из 3842 избирателей за оставшегося в бюллетене отдали голоса 3146. Увы...

Анатолий ЛИПСКИЙ.

Медицинский прогноз погоды на 11 марта

Погода в Минске и области будет формироваться под влиянием поля пониженного атмосферного давления. Содержание кислорода в воздухе будет в пределах средних многолетних значений.

Сегодня маловероятно ухудшение самочувствия основной группы метеозависимых больных. Но к исходу суток лица, страдающие сердечно-сосудистой патологией с опережающей реакцией на неблагоприятные метеоусловия, 12 марта могут почувствовать себя плохо. Им рекомендуется прием лекарственных препаратов, назначенных врачом, включая успокаивающие средства (настойки валерьяны и пустырника).

Антонина КАРОЗА, научный сотрудник БелНИИ кардиологии.

Кто выходит на арену?

Вполне возможно, что через год в Минске появится новый ледовый дворец.

Финансировать его строительство будет минский хозрасчетный хоккейный клуб "Динамо". По сведениям БелаПАН, градостроительный совет ГлавАПУ Мингорисполкома утвердил под строительство участок в районе улицы Притыцкого, за гостиницей "Орбита". Так как раньше на этом месте находилась деревня Тивали, то и дворец решили назвать "Тивали-арена". В комплекс дворца войдут площадка с трибунами на 3 тысячи мест, кафе, магазин, небольшая гостиница, административные помещения.

Стать подрядчиком строительства высказали желание несколько скандинавских фирм.

И снова "прибабах"

Всего несколько дней прошло после шутки неизвестного насчет мин на брестском таможенном переходе, как по 02 раздался новый звонок.

На этот раз заминированным объявлялся главный кинотеатр Бреста "Беларусь" и были затребованы откупные в размере 10.000 рублей. Денег не дали, глупцов не поймали, мин не нашли.

Василий ВИКТОРОВИЧ.

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты" агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, БелаПАН и РИД.

Майстры



Наташа з вас лялечку зробіць!

Наталля Салаўёва — цырульнік. Праўда, ужо больш як два гады яна не працуе, бо сядзіць з малым. Але, відаць, словы "не працуе" да Наташы не зусім падыходзяць, таму што амаль кожны дзень яна ўсё ж людзям прычоскі робіць. А куды падзенешся, калі хатняга бюджэту на ўсіх не хапае. Вось і прыйшлося ёй тэлефанаваць сябрам і знаёмым і прапаноўваць свае паслугі. А зараз, дзякуючы добрым водгукам, да Наташы прыходзяць і зусім незнаёмыя людзі. А інакш і быць не магло, бо ўжо шэсць гадоў Наташа адпрацавала, і прычоскі ў яе атрымліваюцца цудоўныя.

Хутка дэкрэтны адпачынак заканчваецца. І Наташы Салаўёвай хацелася б пачаць сваю справу, адкрыць прыватную цырульню, але адной боязна крыху. Можа, знойдуцца кампаньёны?

Фота Сяргея ПЛЫТКЕВІЧА.

Да ведама!

Хочаце быць псіхолагам? Спяшайцеся ў Гродна

Чуткі аб тым, што нібыта закрываецца медыцынскі інстытут, якія распаўсюджваюцца апошнім часам, пазбаўлены рэальнай асновы.

Хоць пэўныя змяненні ў правілах прыёму студэнтаў і іх навучанні будуць ужо ў гэтым годзе. Напрыклад, усе ўступныя экзамены мяркуецца праводзіць пісьмова. Рыхтаваць інстытут будзе медыкаў агульнага профілю, а не спецыялістаў у пэўнай галіне, як было раней. І яшчэ добрая навіна: абмяркоўваецца пытанне аб адкрыцці ў ГДМІ ўрачэбна-псіхалагічнага факультэта — першага ў Рэспубліцы Беларусь.

РІД.

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

Аб дадатковых мерах па сацыяльнай падтрымцы насельніцтва

У сувязі з павышэннем рэгулюемых рознічных цэн на асобныя віды харчовых тавараў, электраэнергію, тарыфаў на камунальныя і іншыя віды паслуг і ў мэтах сацыяльнай абароны насельніцтва, асабліва малазабяспечаных яго груп, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Увесці на сакавік 1993 г. каэфіцыенты павышэння ставак заработнай платы і службовых акладаў работнікаў, разлічаных у адпаведнасці з іх размеркаваннем па разрадах і каэфіцыентах адзінай тарыфнай сеткі:

у размеры 1,1 — для тарыфікуемых з 1-га па 7-ы разрады работнікаў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, фінансуемых з бюджэту;

у размеры 1,06 — для тарыфікуемых вышэй 7-га разраду работнікаў устаноў і арганізацый аховы здароўя і сацыяльнага забеспячэння, фармацыі, навукі, культуры і мастацтва, фізкультуры і спорту, адукацыі, за выключэннем работнікаў, якім пастановай Дзяржаўнага камітэта па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва ад 26 лютага 1993 г. нумар 15 устаноўлены павышаючыя каэфіцыенты.

2. Правесці ў сакавіку 1993 г. за кошт сродкаў пенсіённага фонду аднаразовыя выплаты ў памеры 500 рублёў непрацуючым пенсіянерам, якія атрымліваюць пенсіі ў органах сацыяльнага забеспячэння. Міністэрству сацыяльнага забеспячэння і Міністэрству сувязі і інфарматыкі забяспечыць указаную выплату.

3. Аб'яднанням, прадпрыемствам і іншым суб'ектам гаспадарання ўсіх форм уласнасці ажыццявіць у межах прадастаўленых ім правоў і згодна з дзеючым заканадаўствам меры па сацыяльнай абароне сваіх работнікаў, удзяліўшы таксама ўвагу асобам, якія працавалі раней у гэтых працоўных калектывах.

4. Даручыць Дзяржаўнаму камітэту па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва і Міністэрству фінансаў сумесна з Дзяржэканампланам да 15 сакавіка 1993 г. унесці прапановы ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь аб павышэнні з 1 красавіка 1993 г. мінімальнай заработнай платы, а таксама аб пераглядзе нарміруемай (базавай) велічыні сродкаў, накіроўваемых на аплату працы ў разліку на аднаго працуючага зыходзячы з мінімальнай заработнай платы.

Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В.КЕБІЧ.

Кіраўнік спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М.КАЎКО.

9 сакавіка 1993 г.

г.Мінск.

Сустрэчы

У Японію — на рандэву

Здаецца, станаўленнем Беларусі як суверэннай дзяржавы, сур'ёзна зацікавіліся ў краіне Узыходзячага Сонца.

На праведзенай днямі сустрэчы першага намесніка старшыні Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па знешніх эканамічных сувязях Міхаіла Марыніча з прадстаўнікамі японскай асацыяцыі па супрацоўніцтву з краінамі СНД і Усходняй Еўропы "Ратоба" абмяркоўвалася пытанне аб удзеле нашай дэлегацыі ў другой канферэнцыі "Усход—Захад". Адбудзецца яна 25—26 красавіка ў Токіо на ўзроўні міністраў эканомікі. З краін былога Саюза на яе запрошаны пакуль што толькі Расія, Казахстан, Украіна і Беларусь.

Міхаіл ЖУРАВОВІЧ, Белінфарм.

г.Мінск.

Факт

Браня моцная. У батальёна.

Асобны батальён патрульна-паставой службы міліцыі пры УУС Магілёўскага аблвыканкама атрымаў у сваё распараджэнне дзве бранiраваныя дэсантныя машыны.

Зброя з бранявікоў знята. Па словах камандавання батальёна, машыны на вуліцах будуць з'яўляцца вельмі рэдка, толькі з мэтай абароны асабовага саставу.

Мікалай АНДРЭЕЎ.

Всем! Всем! Всем!



Луна и урожай

Нетерпеливые дачники и умудренные опытом огородники забросали редакцию письмами: почему среди множества уже изданных посевных календарей нет ни одного, в котором были бы указаны дни прохождения Луны в знаках зодиака? Собирается ли "Народная газета" восполнить этот пробел?

Спешим обрадовать всех, кто серьезно относится к срокам посадки, тем более что нынешний год весьма неблагополучный на них. Для вас профессор Валерий Матвеев просчитал "сатанинские" лунные дни, когда растение нельзя ни пересаживать, ни пасынковать. Эту редкую таблицу, а также таблицу прохождения Луны в знаках зодиака вы сможете приобрести в киосках "Союзпечати" в субботу. Подписчики "Народной газеты" получат ее бесплатно, она выходит приложением к субботнему номеру. Тираж в розницу будет очень небольшим. Поэтому спешите в киоски! "Народная газета" постаралась угодить всем дачникам и земледельцам советами, рекомендациями и таблицами, в которых, как в зеркале, вы увидите лучшие дни посадки и заложите хороший урожай.

Надо же

А земелька-то и впрямь кормилица!

Сотрудники Могилевского горисполкома, заинтересовавшись судьбой земельных участков, которые выделялись гражданам под строительство коттеджей, выяснили, что около 80 процентов этих земель имеют уже новых, а порой даже третьих хозяев.

Иначе говоря, некоторые предприимчивые сограждане и не собирались что-либо строить на выделенных им участках. А решили "загнать" их тем, кто или действительно хочет возвести себе коттедж или собирается еще раз перепродать землю, погрев руки на этом выгодном бизнесе.

Борис МИХЕЕВ.

Мнение

Нельзя работать в Верховном Совете на любительском уровне

Виктор ПИСКАРЕВ, народный депутат Республики Беларусь

Недавно Верховный Совет определил основные положения разрабатываемой Конституции Республики Беларусь. Тем самым созданы необходимые предпосылки для завершения в ближайшее время работы над проектом новой Конституции. Но для этого Конституционной комиссии и ее рабочей группе предстоит еще попытаться найти решение ряда спорных проблем и вопросов. Некоторым из них и посвящены эти заметки.

Прежде всего в проекте Конституции заложен признанный мировой практикой принцип разделения властей — законодательной, исполнительной и судебной. Смысл такого разделения заключается в противодействии всякой форме тирании. Конструкция разделения не выделяет ни одну из властей как приоритетную, исключительную. Поэтому в проекте Конституции весьма важно заложить систему сдержек и противовесов в интересах как разделения, так и обеспечения взаимодействия, взаимосвязи и взаимной ответственности властей. В ряде конституций зарубежных стран — Франции, Испании, Греции — содержатся специальные разделы о взаимоотношениях между парламентами и правительствами. В них регулируются их отношения, формы разрешения возникающих спорных вопросов. Подобные нормы необходимо предусмотреть и в проекте Конституции Республики Беларусь, чтобы избежать кризисных явлений в отношениях между законодательной и исполнительной властями. А такие явления уже сегодня, к сожалению, сотрясают некоторые властные структуры стран СНГ. Надо предусмотреть такие конституционные нормы, которые бы исключали подобное у нас.

Затем, учитывая не слишком высокий уровень да и правовую культуру законодательных актов, принимаемых Верховным Советом, в проекте Конституции следует, опять-таки по опыту ряда зарубежных конституций, предусмотреть специальные нормы, регулирующие процесс подготовки законопроектов. Надо сделать так, чтобы в Верховном Совете срабатывал надежный заслон проектам законов, не имеющим достаточного финансового обоснования или влекущим как сокращение доходов, так и увеличение расходов, а также тем проектам, в которых заложены нормы, регулируемые другими законами, где не соблюдена юридическая техника их подготовки.

Уровень законотворчества находится в прямой зависимости от профессионализма депутатского корпуса, от того, как депутаты занимаются этим делом — постоянно работая в Верховном Совете или на любительском уровне, т.е. совмещая высокие депутатские обязанности с работой на предприятиях, в учреждениях и организациях. К сожалению, такой принцип формирования депутатского корпуса по решению Верховного Совета сохраняется и в проекте Конституции. Тем самым, по существу, сохраняются и условия любительского, непрофессионального отношения депутатов к подготовке и принятию законов, к формированию правовых основ выхода республики из затянувшегося социально-экономического кризиса. Думается, что при очередном обсуждении проекта Конституции данную тему еще раз, взвесив все, выскажутся за то, чтобы в будущем депутаты Верховного Совета работали в нем постоянно, считая законотворчество своей обязанностью, своей профессией.

Пока же налицо явный парадокс: президент, исполнительная и судебная власти будут работать на постоянной, профессиональной основе и лишь законодательная власть, призванная формировать правовые основы для их функционирования, будет заниматься этим на любительском уровне.

В проекте Конституции, исходя из мировой конституционной практики, следовало бы предусмотреть организационные формы исполнения законов как в центре, так и на местах. Это тем более важно, что сегодня в силу ряда причин и условий многие законы не исполняются. Поэтому в проекте Конституции следует четко определить механизм их исполнения. Очень важно, чтобы исполнительная власть была самостоятельной и сильной, способной обеспечить формирование единственно возможной в условиях демократии диктатуры — диктатуры закона. Большая роль в этом принадлежит независимой и сильной судебной власти, призванной выступать арбитром и между человеком и обществом, и между властью и обществом, воспитывать уважение к закону, в том числе и силой принуждения.

Вряд ли можно согласиться с процедурой избрания президента Республики Беларусь, предусмотренной в проекте Конституции. Суть в том, что президента во втором туре голосования могут избрать лишь несколько процентов избирателей. Число же участвовавших в голосовании избирателей не регламентируется, так что, если бы за кандидата в президенты проголосовало избирателей больше, чем против. Таким образом, если из 7 миллионов избирателей республики к избирательным урнам придут только 500 тысяч, из которых 300 тысяч проголосуют "за", а 200 тысяч — "против", то президента фактически изберут 4 процента избирателей. Вот вам и всенародно избранный президент.

Подобной практики избрания президентов нет в других странах и их конституциях. Президенты же, например, России, Украины, Казахстана, Литвы и других стран избраны большинством избирателей, принявших участие в голосовании.

Думается, что и президент Республики Беларусь при любых обстоятельствах может быть избран, если за него проголосуют более 25 процентов избирателей (приняло участие в голосовании более половины избирателей и проголосовало за кандидата более половины из них). Такой принцип избрания президента и следует предусматривать в проекте Конституции.

Да и предельный возраст кандидата в президенты, на мой взгляд, надо установить в проекте Конституции — 65 лет. Ведь если кандидат в этом возрасте будет избран президентом, то к окончанию срока ему уже будет 70 лет. Вряд ли к этому требуются какие-то комментарии, тем более что президент по проекту Конституции будет и главой государства, и главой исполнительной власти.

Таковы вкратце мысли и предложения, возникшие в процессе работы над проектом Конституции Республики Беларусь. Автором они неоднократно высказывались и в Верховном Совете, и в Конституционной комиссии, но не всегда находили понимание и поддержку, почему и вынесены на суд читателей "Народной газеты".

На скрыжаванні думак

Ад рэдакцыі

На наш погляд, адраджэнне гістарычнай праўды немагчыма без плюралізму. Калі ёсць розныя погляды на адну і тую ж з'яву, на адну і тую ж падзею — ці ж трэба аб адных замоўчваць, а другія прапагандаваць як мага гучней?

Выходзячы з гэтага, нам, журналістам "Народнай газеты", не зразумела, чаму ў некаторых газетах артадаксальнага накірунку ў апошні час з'явіліся артыкулы з адным ухілам — скіраваныя на непрызнанне такой даты, як 75-я гадавіна Беларускай Народнай Рэспублікі. Як быццам і не існуе іншых пунктаў гледжання на гістарычнае мінулае. Існуе, і нямала. Заява выканаўчага камітэта Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады — таму пацвярджэнне.

Каб чытачы самі маглі зрабіць аб'ектыўныя вывады, сёння мы знаёмім з пазіцыяй Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады і групы ветэранаў, а ў бліжэйшых нумарах апублікуем матэрыялы "круглага стала", які адбудзецца з нагоды 75-годдзя БНР у Акадэміі навук Беларусі.

Залаты радок у нашай гісторыі

Пазіцыя Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады

25 сакавіка мы адзначым 75-я ўгодкі з дня абвяшчэння незалежнасці нашай краіны.

Выканаўчы камітэт Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады з гонарам падкрэслівае, што абвяшчэнне БНР і яе незалежнасці залатым радком упісана ў гісторыю беларускага сацыялістычнага руху.

Бальшавіцкі ўрад Леніна, які апублікаваў Дэкларацыю правоў народаў Расіі, а таксама мясцовая бальшавіцкая арганізацыя катэгарычна выступілі супраць дзяржаўнасці Беларусі. Пры гэтым улічваўся геапалітычны фактар. Праз Беларусь бальшавікі мелі намер экспартаваць у Еўропу сваю рэвалюцыю. Прызнаць Беларусь бальшавікі не маглі і таму, што гэта азначала б для іх страту ўлады: мясцовая камуністычная арганізацыя складалася амаль выключна з прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей.

Разваліўшы старую армію, бальшавікі пакінулі Беларусь сам-насам з Германіяй. У лютым 1918 года амаль уся наша краіна апынулася ў зоне нямецкай акупацыі. Кайзераўскі ўрад значную частку беларускіх земляў аддаў пад кантроль Украіны і Літвы.

У самым пачатку сакавіка 1918 года ўрад Леніна, не пытаючы волі беларускага народа, падпісаў у Бярэсці мірны дагавор з Нямеччынай. Наша краіна стала закладам пад шасцімільярдную кантрыбуцыю, якую Масква абавязалася выплаціць Берліну.

Абараніць правы Беларусі ўзяліся законныя прадстаўнікі народа, абраныя на Усебеларускім з'ездзе.

20 лютага 1918 года выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда сфарміраваў першы нацыянальны ўрад, які цалкам складаўся з сяброў Беларускай сацыялістычнай грамады.

9 сакавіка — пасля таго, як Масква ратыфікавала Берасцейскі дагавор, — выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда абвясціў Беларусь Народнай Рэспублікай.

Абвяшчэнне БНР было адказам на імперыялістычную палітыку бальшавіцкай Расіі і кайзераўскай Германіі.

9 сакавіка было абвешчана ўсеагульнае, прамое і роўнае выбарчае права, грамадзянам прадастаўляліся свабода друку, права ствараць палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі, прафсаюзы, гарантаваліся права на забастоўкі, свабода сумлення, недатыкальнасць асобы і памяшкання, тайна карэспандэнцыі — усё тое, чаго народ быў пазбаўлены пры бальшавіцкім рэжыме. Зямля, яе нетры, лясы і воды абвяшчаліся ўласнасцю рэспублікі. Зямля перадавалася ў спадчыннае карыстанне таму, хто на ёй працуе. Уводзіўся васьмігадзінны рабочы дзень. (Прыватная ўласнасць у гандлі, сферы паслуг і прамысловасці не касавалася). Усім нацыянальным меншасцям прадастаўлялася права на нацыянальна-персанальную аўтаномію, а іх прадстаўнікі ўводзіліся ў склад рады БНР.

Такім чынам, былі закладзены асновы дэмакратычнай, прававой і сацыяльнай беларускай дзяржавы.

Бальшавіцкі і кайзераўскі ўрады не прызналі БНР. Масква па-ранейшаму глядзела на Беларусь як на "Северо-Западный край", а Берлін лічыў нашу краіну акупаванай расійскай тэрыторыяй.

У такіх варунках Радзе БНР не заставалася нічога іншага, як абвясціць 25 сакавіка незалежнасць Беларусі.

Развіць усе формы беларускай дзяржаўнасці ўраду БНР не далі кайзераўскія акупанты, якія дакладна выконвалі Берасцейскі дагавор з бальшавікамі. Яны перашкаджалі стварэнню мясцовых органаў улады, паліцыі, судоў. Яны не далі стварыць беларускае войска і пакінулі Беларусь безабароннаю перад бальшавікамі, якія ў 1919 годзе здалі Беларусь польскім акупантам, а потым падзялілі яе з Літвой, Латвіяй і Польшчай.

Поспехі БНР у культурным будаўніцтве (школы, тэатр, друк) прымусілі бальшавікоў і польскіх шавіністаў прызнаць, што ёсць беларускі народ, яго мова, культура.

БНР прызналі Украінская Народная Рэспубліка, Літва, Латвія, Чэха-Славакія, Фінляндыя, Балгарыя і іншыя краіны. Голас яе прадстаўнікоў гучаў на міжнародных канферэнцыях у Парыжы і Генуі. І гэта прымусіла бальшавікоў двойчы (у 1919 і 1920 гг.) абвяшчаць БССР. Гэта прымусіла польскі ўрад лічыцца з правамі беларусаў. Існаванне ўрада БНР у эміграцыі прымусіла Маскву вярнуць у склад Беларусі частку яе віцебскіх, смаленскіх і магілёўскіх земляў.

Абвяшчэнне БНР і яе незалежнасці было паваротным пунктам у гісторыі беларускага народа. Ідэя нацыянальнай самабытнасці, ідэя беларускай дзяржаўнасці стала невынішчальнаю.

Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада, якая працягвае і развівае традыцыі Беларускай сацыялістычнай грамады, з першага дня свайго існавання адстойвала і адстойвае ідэю аб поўнай дзяржаўнай незалежнасці Беларусі.

БСДГ лічыць, што ідэалы 25 сакавіка ў Рэспубліцы Беларусь яшчэ не дасягнуты. Наша краіна яшчэ не стала дэмакратычнаю, прававою і сацыяльнаю дзяржаваю. Існуе рэальная пагроза страты незалежнасці.

У эміграцыі працягвае сваю дзейнасць Рада БНР. Яна павінна дзейнічаць да таго часу, пакуль не будзе прынята дэмакратычная Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, пакуль не будуць праведзены выбары ў новы орган заканадаўчай улады на падставах усеагульнага, прамога, роўнага выбарчага права, пакуль з тэрыторыі Беларусі не будуць выведзены ўсе замежныя войскі.

Беларусы за мяжою павінны ўсвядоміць, што ўлада ў Рэспубліцы Беларусь належыць бальшавікам, былой наменклатуры. Гісторыя паказала ўсю іх няшчырасць і вераломнасць. Склікаць з'езд беларусаў свету ў гэтым годзе немэтазгодна. Паслухмяныя сродкі масавай інфармацыі выкарысталі б з'езд дзеля агітацыі за цяперашні ўрад.

Выканкам БСДГ прапануе ўсім дэмакратычным і палітычным партыям і арганізацыям на Бацькаўшчыне і ў замежжы правесці III Усебеларускую палітычную канферэнцыю. Такая канферэнцыя магла б абмеркаваць палітычную сітуацыю ў Рэспубліцы Беларусь.

Мы віншуем усіх жыхароў Беларусі, усіх беларусаў за межамі Бацькаўшчыны з 75-і ўгодкамі абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі і яе незалежнасці.

Ідэалы, сфармуляваныя 9 і 25 сакавіка 1918 года, вечныя, як вечны беларускі народ.

Жыве Беларусь!

Выканаўчы камітэт Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады.

25 сакавіка: чыё гэта свята?

Дэструктыўныя сілы прыкладаюць усе намаганні, каб уцягнуць нашых суайчыннікаў ва ўшанаванне так званай Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) і ў святкаванні гадавін з дня абвяшчэння яе "незалежнасці".

Вось і цяпер у друку з'явіліся заклікі да ўрачыстай сустрэчы 25 сакавіка 1993 г. 75-й гадавіны "незалежнасці" БНР.

Нягледзячы на зацятыя спрэчкі і палемікі па гэтаму пытанню, сацыяльна-палітычная сутнасць БНР выглядае даволі проста і можа стаць зразумелай для кожнага нашага суайчынніка. Гэта была спроба стварыць буржуазную дзяржаўнасць у Беларусі. Карыстаючыся тым, што пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі Савецкая ўлада абвясціла права нацый на самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў, беларускія нацыянал-экстрэмісты прынялі захады да стварэння дзяржавы з капіталістычным ладам, з панаваннем памешчыкаў і буржуазіі, з эксплуатацыяй і прыгнечаннем працоўнага люду.

БНР была абвешчана ў сакавіку 1918 г. у Мінску ва ўмовах нямецкай акупацыі, і кіраўнікі БНР паслалі прывітальную тэлеграму германскаму кайзеру Вільгельму з падзякай за падтрымку, з просьбай аб заступніцтве і апякунстве, што азначала падпарадкаванне Беларусі інтарэсам імперыялістычнай Германіі. У далейшым так званая БНР аказалася ў залежнасці ад буржуазна-памешчыцкай Польшчы і яе акупацыйнага рэжыму.

Палітычнае банкруцтва авантуры з буржуазнай Беларускай Народнай Рэспублікай прывяло да таго, што 15 кастрычніка 1925 года ў Берліне Рада народных міністраў БНР пастанавіла: "Спыніць існаванне ўраду БНР і прызнаць Менск адзіным цэнтрам нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння Беларусі". У гэты ж дзень на палітычнай нарадзе актыву БНР была прынята пастанова, у якой прызнавалася імкненне Беларускай Савецкай Рэспублікі "да здзяйснення нацыянальна-дзяржаўнага ідэалу беларускага народа" і было абвешчана, што актыўная барацьба супраць Савецкай Беларусі (як цэнтра беларускага адраджэння) лічыцца "здрадай справе беларускага вызваленчага руху".

Вось гэтых гістарычных фактаў якраз і не любяць успамінаць сучасныя апалагеты БНР. А ім сёння вельмі карысна было б падумаць аб тым, што нават расчараваныя ў сваіх ранейшых ідэалах лідэры БНР заклікалі не здраджваць нашай Бацькаўшчыне — Савецкай Беларусі.

Не падтрымаўшы буржуазнай БНР, беларускі народ у жорсткай барацьбе супраць замежнай інтэрвенцыі і ўнутранай контррэвалюцыі дамогся ўстанаўлення ўласнай савецкай, сацыялістычнай дзяржаўнасці — 1 студзеня 1919 года было абвешчана ўтварэнне БССР.

З таго часу ў сваёй Савецкай Сацыялістычнай рэспубліцы народ дасягнуў выдатных поспехаў на шляху развіцця эканомікі, культуры, матэрыяльнага дабрабыту.

У Савецкай Беларусі пры падтрымцы братніх народаў СССР былі створаны буйная першакласная прамысловасць, высокапрадукцыйная сельская гаспадарка. Рэспубліка па вытворчасці малака і мяса на душу насельніцтва выйшла на другое месца ў свеце. Жыхары Беларусі былі добра забяспечаны прадуктамі харчавання і прамтаварамі. Савецкія людзі маглі ганарыцца перад усім светам самай нізкай кватэрнай платай, бясплатным медыцынскім абслугоўваннем, бясплатнай адукацыяй. Створаныя за гады Савецкай улады свая Акадэмія навук, 35 вышэйшых навучальных устаноў, школы, бібліятэкі, клубы, тэатры, музеі, кніжныя выдавецтвы ўзнялі беларускі народ да ўзроўню вышэйшых дасягненняў сусветнай культуры.

Дык як жа могуць грамадзяне Савецкай Беларусі ўслаўляць капіталістычны лад і верыць плёткам аб тым, быццам гэты лад прыгнёту і эксплуатацыі якраз толькі і патрэбен нашаму народу?

А вось прыхільнікі капіталістычнага ладу дагэтуль шкадуюць, што ён не атрымаў перамогі над Савецкай уладай адразу пасля Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, у час грамадзянскай вайны. Яны хочуць, каб вольналюбівы беларускі народ ушаноўваў не прызнаную ім у 1918—1920 гг. буржуазную так званую БНР.

Прыхільна адносіцца да святкавання 75-й гадавіны БНР могуць цяпер толькі тыя, хто не прызнае выдатных дасягненняў беларускага народа за гады Савецкай улады, хто хоча зноў надзець на наш народ ярмо капіталістычнай эксплуатацыі, каму падабаецца з'яўленне на Беларусі мільянераў і мільярдэраў, каго не хвалююць галеча і беспрацоўе рабочых і сялян нашай рэспублікі.

Юбілей БНР — гэта свята прыхільнікаў і апалагетаў капіталізму.

Патрыёты Савецкай Беларусі не могуць адзначаць юбілеі сацыяльнага прыгнёту працоўных, юбілеі капіталістычнага ладу, не могуць ушаноўваць юбілеі залежнасці ад іншаземных акупантаў..

Н.А.АЧАСАВА, настаўнік гісторыі; **Ф.І.АМЯЛЬЧЭНЯ**, юрыст; **А.М.БАНДАРОВІЧ**, старшыня Цэнтральнага праўлення Усебеларускай асацыяцыі інвалідаў вайны; **А.І.БАРДАНАЎ**, Герой Савецкага Саюза; **А.М.БЕНЕДЗІКТОВІЧ**, настаўнік гісторыі; **А.М.БЫКАЎ**, генерал-маёр, вайсковы гісторык; **В.А.ВАЙЦЯХОЎСКІ**, старшыня Мінскага гарадскога клуба гістарычных ведаў, доктар эканамічных навук; **П.С.ГЕРАСІМОВІЧ**, настаўнік гісторыі; **М.Ц.ГУЦІЕЎ**, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь; **А.І.ЗАЛЕСКІ**, доктар гістарычных навук; **Д.А.ІВАНОЎ**, генерал-лейтэнант, старшыня Саюза афіцэраў Рэспублікі Беларусь і іншыя — усяго 43 подпісы.

Віншуем!



"Наконт двухсотгоддзя не ведаю, а вось гадоў праз дваццаць у госці запрашаю!"

— менавіта такія словы сказаў, развітваючыся з намі, стогадовы юбіляр Васіль Лявонцьевіч Стасенка.

Чаго толькі не пеража ён за свае сто гадоў! Быў гусарам у першую сусветную вайну, у 1915-м у Польшчы трапіў у палон, ледзь не ажаніўся з нямецкай дзяўчынай Эме, але лёс раскідаў маладых людзей. Васіль Стасенка апынуўся ў Маскве, стаў высокакваліфікаваным слесарам, увесь Саюз аб'ездзіў, працуючы на авіярамонтных заводах. У Вялікую Айчынную таксама рамантаваў самалёты ў 96-м гвардзейскім авіябамбардзіровачным палку 16-й паветранай арміі.

А з 1947 года аж да сваіх сямідзесяці пяці гадоў Васіль Лявонцьевіч працаваў на Мінскім мотавелазаводзе.

Зараз Стасенку споўнілася сто гадоў. Ён жыве ў асобным пакоі ў Мінскім сацыяльным цэнтры абслугоўвання пенсіянераў. Не жаліцца ні на што, бо прыходзяць сябры, не забываюць ветэрана і завадчане. А сам Васіль Лявонцьевіч цудоўна памятае вельмі і вельмі шматлікія эпізоды са свайго доўгага жыцця. Расказваючы, любіць пацягнуць цыгарэту, а на свята не супраць і ста грамаў. А як жа інакш — жыццё ёсць жыццё. Зразумела, не адмовіліся выпіць за здароўе Васіля Лявонцьевіча і мы...

* Васіль Лявонцьевіч Стасенка.

* Юбіляра віншуюць пратадыякан царквы Аляксандра Неўскага айцец Пётр, манахіня маці Ганна і сёстры міласэрнасці.

Фота Сяргея ПЛЫТКЕВІЧА.

Ці чулі?

Партыя патрабуе...

Аб'яднаная дэмакратычная партыя Беларусі на чале са сваім лідэрам Аляксандрам Дабравольскім накіравала на імя Старшыні Вярхоўнага Савета рэспублікі Станіслава Шушкевіча адкрытае пісьмо.

У ім гаворыцца аб неабходнасці тэрмінова стварыць парламенцкую камісію па расследаванню справы аб выкарыстанні дзяржаўных валютных сродкаў Міністэрствам аховы здароўя.

Справа ў тым, што Кантрольная палата, разглядаючы гэтае пытанне, выявіла яўныя парушэнні, аднак далей канстатацыі факта не пайшла.

БелаПАН.

Спасибо!

Нам были созданы прекрасные условия

Уважаемая "Народная газета"!

Не откажите в просьбе руководителей детских групп СШ N19 Центрального района и СШ N13 Железнодорожного района г.Гомеля, проходивших оздоровление в санатории "Белоруссия", расположенном на Рижском взморье.

Через твои страницы мы хотим выразить глубокую благодарность Гомельскому областному Совету профсоюзов, лично главному врачу санатория "Белоруссия" Барановскому Ф.И. и его заместителям Чайковской И.С. и Костееву Г.Ф. за то, что ими были созданы прекрасные условия для оздоровления, отдыха и лечения наших ребят.

Нас встретили на вокзале, автобусом санатория доставили к месту отдыха, разместили в прекрасных 2-местных номерах, организовали отличное питание, учитывая возраст и здоровье детей.

Назавтра ребята были направлены на прием к врачам, каждый из них прошел детальное обследование и получил соответствующее лечение, оздоровительные процедуры.

И в дальнейшем дети находились под постоянным наблюдением врачей.

За время пребывания в санатории ребята принимали различные ванны, массаж, ингаляцию, КУФ, УВЧ, посещали галокамеру, сеансы психотерапии, прошли санирование в стоматологическом кабинете.

Для наших детей было налажено отличное четырехразовое сбалансированное, витаминизированное питание для оздоровления детей, прибывших из зоны, пораженной радиацией. В рационе ребят постоянно были фрукты и овощи.

В санатории созданы прекрасные условия для отдыха и развития детей: через день проводятся экскурсии в Ригу, Юрмалу, по историческим местам, в музеи, ежедневно демонстрируются видеофильмы, проводятся дискотеки и все это совершенно бесплатно. Все расходы санаторий взял на себя.

В распоряжение ребят был предоставлен спортивно-тренажерный зал, зал лечебной физкультуры. Ребята имели возможность играть в теннис, бадминтон, бильярд, заниматься на тренажерах, кататься на лыжах.

Санаторий находится в живописном уголке Латвии, на берегу моря. Чистый сосновый воздух благоприятно воздействует на организм.

Хотелось бы, чтобы вышестоящие органы в дальнейшем узаконили оздоровление детей в санатории "Белоруссия" согласно соответствующим договорам. Это окупится с лихвой через несколько лет, когда дети и их родители скажут всем большое человеческое "спасибо".

В таких прекрасных условиях наши дети отдыхали впервые, хотя оздоровлялись мы уже и в Молдове, и на юге, и в других местах. Оказывается, лучше, чем в нашей "Белоруссии", условий мы не встречали.

А.СТЕПАНЕНКО, В.ПАНЧЕНЯ, руководители групп СШ N 19 и СШ N13.
Т.ЮДЕНОК, Л.ДЮНДИКОВА, В.ШИРЯЕВА, Г.КУЧЕРОВА, воспитатели.

Репортер узнал

Хотели отдать "концы"

Большая партия отходов ковровых нитей, приготовленных к отправке из города, задержана на путях сотрудниками Витебского УКГБ.

Десять тонн полушерстяных "концов", из которых умелые люди вяжут свитера, джемпера и другую одежду, согласно липовому договору и с разрешения горисполкома, ковровое объединение предназначало жителю одной из южных республик СНГ. И это в то время, когда витебские инвалиды-надомники остро нуждаются в сырье для работы ради хлеба насущного.

Следствие продолжается.

Сергей СЕРГЕЕВ.

Дома, где укрепляются сердца

В Молодежном и Октябрьском микрорайонах Светлогорска открылись центры медико-социальной помощи инвалидам, пенсионерам, одиноким пожилым людям.

Опытные медики оказывают здесь необходимую медицинскую помощь, а работники горсобеса консультируют горожан по вопросам пенсионного обеспечения. Инициативу в создании реабилитационных центров проявил городской комитет Общества Красного Креста.

Анатолий ИВАНОВ.

Как "мурка" местных "васек" под ствол подвела

В военном городке Засимовичи под Пружанами ЧП.

На свою хозяйку бросилась разъяренная сиамская кошка. Приговор ветеринаров безжалостен — бешенство. В результате, под профилактические мероприятия попали 39 человек, госпитализированных с определением "малой группы риска". Но больше всего не повезло многочисленным бездомным "бобикам" и "васькам" — согласно решению райисполкома, они были отстреляны.

Василий САРЫЧЕВ.

ЗАМЕЖЖА

* ІТАР-ТАСС * НАРОДНАЯ ГАЗЕТА *

Пульс дня

Вновь — поддержка из-за океана

"Администрация Клинтона усиленно работает над пакетом мер в поддержку России", который руководитель США обсудит с российским президентом Борисом Ельциным в ходе их встречи в верхах 3—4 апреля в Ванкувере.

Об этом заявил государственный секретарь США Уоррен Кристофер. Выступая в одном из подкомитетов Палаты представителей, он, в частности, сказал, что акцент при этом делается на том, чтобы облегчить время задолженности Советского Союза. Кроме того, речь пойдет о помощи американских экспертов, предоставлении современных технологий, а также, "вероятно, некоторой прямой американской помощи россиянам" в этот тяжелый период.

Поддержка идет и из Англии...

Великобритания поддержала предложение президента Соединенных Штатов Билла Клинтона провести срочное внеочередное совещание семи ведущих индустриальных стран мира для обсуждения мер по содействию экономическим реформам в России.

Намерения есть и у "семерки"

Семь ведущих держав Запада намерены в самое ближайшее время выступить с совместным заявлением, в котором будет выражена полная поддержка осуществляемых в России реформ.

Об этом сообщили корреспонденту ИТАР—ТАСС информированные источники, сославшиеся на высказывание неназванного сотрудника японского правительства. Это заявление, в котором России, видимо, не будет обещано никаких конкретных сумм в виде западной помощи, расценивается как отражение стремления стран "семерки" продемонстрировать решительную моральную поддержку президенту Борису Ельцину в условиях сложной внутриполитической и экономической ситуации в России.

Поступила просьба о продлении мандата ООН

Союзная республика Югославии призвала Совет Безопасности продлить мандат сил ООН в бывшей Югославии еще на 12 месяцев во избежание возобновления крупномасштабных военных действий со стороны Хорватии против сербского населения.

Об этом говорится в письме председателя правительства СРЮ Радое Контича, которое распространено в штаб-квартире ООН в качестве документа Совета Безопасности.

Бон — без конца и края...

В истекшие двое суток продолжались бои в северо-восточной Боснии между сербскими и мусульманскими формированиями.

Боснийские мусульмане начали наступление с целью восстановления сухопутной связи с анклавами в районе Коневич-Поле, Сребреница, Жепа.

Только раз бывает в жизни встреча

Возможностью, "предоставляющейся только один раз", назвал государственный секретарь США Уоррен Кристофер очередной раунд переговоров по мирному урегулированию на Ближнем Востоке, который откроется здесь 20 апреля.

Приглашения участвовать в нем были направлены Соединенными Штатами и Россией "всем участникам ближневосточного процесса", включая Израиль, Сирию, Иорданию и Ливан. Этот шанс, отметил он, должен быть использован для достижения мира между Израилем и арабскими государствами.

Ельцин в Японии был бы нищим

Опубликованы сведения о зарплате первых лиц развитых стран мира за прошлый год. Итак, премьер-министр Японии получает в год 344 500 долларов, канцлер Германии — 220 000, президент США — 200 000, президент Италии — 170 000, премьер-министр Великобритании — 118 000, президент Франции — 93000 долларов, зарплату Бориса Ельцина на этом фоне и называть страшно, потому что это всего 1360 долларов в год, т.е. в 253 раза меньше, чем у премьер-министра Японии, и в 68 раз меньше, чем у президента Франции.

А теперь о среднем годовом доходе всех простых смертных. Японец получает 35 728 долларов, немец — 34 400, американец — 19 082, итальянец — 17 000, британец — 24550, француз — 21 000, россиянин 288 долларов. Получается, среднестатистический россиянин зарабатывает в 124 раза меньше японца и даже президент России получает в 26 раз меньше, чем в среднем житель Японии. Иначе говоря, там он был бы последним нищим.

